**Г. С. Хіневіч**

# ВОБРАЗ МАЦІ-ЗЯМЛІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Слова “вобраз” у літаратуразнаўстве шматзначны тэрмін. Вобраз-архетып – гэта сваеасаблівая міфалагема пачуццёвага адлюстравання ў разумовае абагульненне і далей у мастацкую рэчаіснасць ад рэальнага да ідэальнага (у працэсе пазнання) і ад ідэальнага да рэальнага (у працэсе творчасці). На моўным узроўні твора вобраз тоесны паняццю “троп” (Літаратурны энцыклапедычны слоўнік, 1987). Творца прымушае з дапамогай выкарыстання ў творах архетыпаў чытача глыбей зразумець сэнс твора. У выніку гэтага выбудоўваецца ланцужок паняццяў: культура – сімвал – міф – архетып – чалавек. Міфалагемы парушаюць “аднастайнасць” тэксту, канцэнтрыруюць на сабе ўвагу чытача, міфалагемы выступаюць не проста ў ролі “архетыповых маркераў”, але кропак перасячэння мінулага цэлага народа і індывідуальнай памяці аўтара.

Ва ўсіх народаў свету існавалі міфы пра паходжанне Зямлі. У сусветнай міфалогіі Зямля ўзнікае сама з першага бязладдзя. У нашых продкаў крывічаў з Хаосу спачатку нараджаецца Багіня-Прародзіца Жыва-Каляда, Маці-Зямля – гэта і выток жыцця, і само жыццё наогул. Характэрна шматграннасць і разнастайнасць асэнсавання вобраза зямлі ў народнай свядомасці. Такім чынам, міфалагема Зямлі адлюстроўвала ў мінулым зямлю як антрапамарфічную істоту (І. В. Казакова, 2020).

Пісьменнік стварае архетыпы, адлюстроўвае у сваёй творчасці гісторыю беларускага селяніна, аднаўляе назапашанае пакаленнямі. Можна казаць, што ў беларускай літаратуры своеасаблівым сімвалам, увасабленнем нацыяналь-

най гісторыі, спадчыны, менталітэту з’яўляецца архетып Маці-Зямлі. *«Чаму ж чалавек заўсёды сумуе па сваёй роднай зямлі, як дзіця па маці?» – пісаў Ян Баршчэўскі.* Матыў па-сапраўднаму светлага, вечнага архетыпу Маці-Зямлі апісваецца ў паэзіі і прозе: у паэме Я. Коласа «Новая зямля», паэме А. Куляшова “Далёка да акіяна”, апавяданнях Я. Брыля “Маці”, “Сцежка-дарожка” і аповесці “Ніжнія Байдуны”, аповесці А. Кудраўца “Раданіца” (А. М. Макарэвіч, 2008).

У п’есе “Раскіданае гняздо” адлюстроўваецца пакутлівы шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны і лепшай долі. Зямля для Купалы – гэта не проста глеба пад нагамі, а неад’емная частка існавання, аснова жыцця і духоўнасці народа. Гэта зямля, якую трэба любіць, шанаваць і бараніць, бо яна – крыніца сілы і надзеі на будучыню. У аўтара ёсць надзея на выратаванне лёсу роднай зямлі. Архетып Зямлі з’яўляецца скразным ва ўсёй беларускай літаратуры.